## Список использованных источников

1. Павлова, А.М. Психологические особенности профессионально-личностного потенциала субъекта трудовой деятельности: ав-тореф. дис. … канд. психол. Наук / А.М. Павлова. – Казань, 2004. - 28 с.
2. Парамонов, Д.Ю. Психологические основы профессионального развития личности / Д.Ю. Парамонов // Личность в меняющемся мире: здоровье, адаптация, развитие [Электронный научный журнал]. – 2015. - № 3(10). – С. 106 – 115. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/psihologicheskie-osnovy-professionalnogo-razvitiya-lichnosti. Дата обращения: 18.03.2021.
3. Психологические тесты; под ред. А.А. Карелина. Т.1. - М., 2000. - С. 25 – 29.
4. Сергеева Н.И. Профессионально-личностное саморазвитие как цель профессионального роста педагога / Н.И. Сергеева // Современные проблемы науки и образования. – 2015. – № 2-1.; Режим доступа: http://science-education.ru/ru/article/view. - Дата обращения: 12.03.2021.

УДК 741+378.147.025.7

# ВУЧЭБНЫ РЫСУНАК, ЯК ФАКТАР ПСІХІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**Барбарчык М.І., дацэнт**
*Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Анатацыя:
Разгляюдаюцца псіхалагічныя фактары і іх роля ў забеспячэнні якаснага навучання рысунка. Адлюстравана неабходнасць фарміравання ў студэнтаў не толькі прафесійнай кампетэнцыіі, але і развіцце ў іх псіхічных уласцівасцей, здольных палепшыць адукацыйны працэс.

Працэс навучання рысунку ўяўляе сабой шэраг паслядоўных дзеяў выкладчыкаў і кіруемых імі студэнтаў, накіраваных на свядомае і трывалае засваенне сістэмы ведаў, уменняў і навыкаў. У выніку чаго здейсняецца развіццё пазнавальных сіл, развіццё

разумовай і фізічнай працы, адбываецца фарміраванне навуковага ўспрымання і прафесійнай культуры.

Метадычнай асновай вучэбнага працэса з'яўляецца гіасілогія альбо філасофія пазнання. Гіасілагічны падыход дае магчымасць зразумець і ўлічыць агульныя заканамернасці пазнання ва ўсіх вучэбных дысцыплінах у тым ліку і пры навучанні рысунку. Само пазнанне ў час навучання здзейсняецца як індывідуальны асабісты працэс. У гэтай сувязі неабходны разгляд псіхалагічных заканамернасцей навучання студэнтаў. Веданне і ўлік асноў гіасілагічных і псіхалагічных асноў навучання якія садзейнічаюць рэалізацыі паспяховага педагагічнага кіраўніцтва дзейнасцю вучняў. Неабходна больш падрабязна разглядзець ролю псіхалагічных фактараў якія ўплываюць на працэс навучання, і непасрэдна на працэс навучання рысунку. У гэтай сувязі важным з'яўляецца веданне уласцівых чалавеку псіхічных працэсаў. Псіхалагічная навука падзяляе іх на два класы:

- пазнавальныя (адчуванне, ўспрыманне, увага, памяць, мысленне, уяўленне, мова );
- эмацыянальна -валявыя ( пачуцці, воля ).

Не менш важнымі ў працэсе навучання рысунку з'яўляюцца і псіхічныя ўласцівасці:

- тэмперамент (флегматычнасць, халерызм, меланхалічнасць, сангвінізм );
- характар (упэўненасць, рашучасць, таварыскасць, альбо наадварот);
- здольнасці (адоранасць, геніяльнасць, таленавітасць);
- накіраванасць (арганізаванасць, фанатызм, матывацыя).

Вучэбны рысунак з натуры перш за ўсё пачынаецца з вывучэння натуры. Гэта значыць з яе ўспрымання.

Ўспрыманне (лат. Perseptio) – гэта адлюстраванне ў свядомасці чалавека прадметаў і з'яў рэальнага свету, а вынікам успрымання з'уляется пабудова ў яго свядомасці цэластнай канструкцыі вобразу аб'екта. Ў рысавальшчыка гэта асаблівы і складаны псіхічны працэс, які ўзнікае на аснове зрокавых адчуванняў. Успрыманне накіравана на вывучэнне успрымаемага аб'екта з мэтай выявы яго на паперы альбо кардоне.

Існуюць розныя псіхалагічныя мадэлі фарміравання вобраза у працэсе успрымання:

- сцімульная, якая мае толькі рэфлексійную прыроду і праяўляецца праз раздражляльнікі;

- дзеячая, якая сцвярджае, што вобраз, які чалавек успрымае, з'яўляецца не столькі вынікам рэакцыі псіхікі на раздражляльнікі, колькі наступствам неперапыннай пабудовы вобраза суб'ектам. Гэтая мадэль якраз і адпавядае дзейнасці рысавальшчыка, калі успрыманне натуры адбываецца асмыслена і прадугледжвае разуменне таго, што успрымаецца. І гэта заўсёды дапаўняецца мінулым вопытам.

Дзеячая мадэль прадугледжвае успрыманне вучнем натуры канстантна і выбарча, калі адбываецца свядомае забяспячэнне трываласці вобраза натуры, і калі галоўныя і больш неабходныя дэталі натуры успрымаюцца рысавальшчыкам больш уважліва, чым другасныя.

Псіалогія разглядае успрыманне як дзеянне альбо адвольнае, альбо наўмыснае. І калі яго разглядаць у кантэксце вучэбнага працэсу то яно заўсёды наўмыснае, заснаванае на усведамлёнасці, волі, мэтанакіраванасці, як выкладчыкаў так і студэнтаў.

Як адметная псіхічная асаблівасць чалавека сваю ролю ў мастацкай адукацыі адыгрывае увага. Важнай для рысавальшчыка з'яўляецца уважлівасць таму, што яна дазваляе скацэнтрыраваць увагу менавіта на тым аб'екце, які патрэбен для вывучэння студэнту. Ўважлівасць мае шэраг уласцівасцей і характырыстык, якія ўплываюць на дзейнасць, як студэнтаў, так і выкладчыкаў.

Да прыкладу такая якасць псіхікі, як канцэтрацыя увагі дазваляе ў патрэбны момант выконваць работу з высокай ступенню прадуктыўнасці. Звычайна канцэтрацыя увагі патрэбная рысавальшчыку пры выкананні накідаў альбо хуткіх рысункаў. І наадварот пры выкананні доўгіх па часе рысункаў вучню неабходнай з'яўляецца такая псіхічная ўласцівасць, як устойлівасць увагі, якая абумоўлена працягласццю засяроджання на аб'екце. Важнай характырыстыкай псіхічнай дзейнасці пры рысаванні з'яўляецца пераключэнне увагі, якая вызначаецца хуткасццю пераноса увагі з аднаго аб'екта на іншы. Пры выкананні працяглай работы пераключэнне ўвагі студэнтам з'яўляецца фактарам стомленасці, але ў той жа час гэта з'яўляецца фактарам падтрымкі працаздольнасці. Выкладчыкі несумненна павінны ўлічваць гэтую акалічнасць псіхічнага стану студэнтаў.

У сувязі з гэтым важнай з’яўляецца такая ўласцівасць псіхічнай дзейнасці, як размеркаванне увагі. Дарэчы для выкладчыка гэтая уласцівасць не толькі фактар псілхалогіі, але і фактар арганізацыйны. Калі вучэбны працэс набывае эфектыўнасць пры правільна арганізаваных занятках і правільна  пабудаванай методыцы выкладання.

Вучэбная праграмы па рысунку пабудаваныя такім чынам,калі кожнае новае заданне больш складанае чым папярэдняе, што натуральна ўскладняе працэс навучання. Студэнтам бывае цяжка распачаць новую работу, не гледзячы на алгарытм які задае выкладчык, на яго тлумачэнні і падказкі. Ўзнікае праблемная сітуацыя, якая заключаецца у канфлікце паміж умовамі і патрабаваннямі пастаўленай задачы, калі паяўляюцца новыя мэты, а старыя сродкі і спосабы яе дасягнення аказваюцца неэфектыўнымі.

Дапамагае ў такіх выпадках звычайна такая псіхічная ўласцівасць,як мысленне. Мысленне студэнта – гэта па сутнасці спецыфічны від дзейнасці арыенціровачна-даследчага характара, дзейнасці, якое дазваляе крэатыўна рашаць вучэбныя праблемы і развівае асобу творцы. Толькі студэнт, які здольны прааналізаваць сітуацыю і прыняць правільнае рашэнне, можа разлічваць на пасяховае выкананне пастаўленых задач.

Калі разглядаць памяць, як з’яву псіхічных працэсаў у дачыненні да навучання рысунку, то гэта сістаматычнае захоўванне мінулага вопыту, якое забяспечвае паўторнае яго выкарыстоўванне пры рысаванні. Памяць дазваляе вучню звязаць у адзіны адукацыйны працэс: мінулае, сучаснае, будачае. Гэта значыць, што студэнт мае магчымасць выкарыстоўвываць у вучэбнай практыцы свой вопыт, а так сама карысны вопыт іншых. Памяць, як псіхічная ўласцівасць, дазваляе набываць і замацоўвываць веды, ўменні, навыкі і больш дасціпна выконваць наступныя вучэбныя заданні.

Кожны навучэнец індывід, а яго тэмперамент з’яўляецца базавай характырыстыкай асобы. Таму мае значны ўплыў на яго характар, здольнасці, мэтанакіраванасць, якія ў сваю чаргу ўплываюць на працаздольнасць студэнта, яго ўменне мець нармальныя, добразычлівыя адносіны з выкладчыкам і аднагрупнікамі.

Вядомы чатыры тыпы тэмперамента, якія ўжо ўзгадваліся вышэй. Кожны з іх мае моцныя і слабыя бакі, якія праяўляюцца ў студэнтаў ў час навучання рысунку.

Да прыкладу, студэнт-халерык мае высокі дынамічны склад мыслення, хутка схоплівае патрэбную інфармацыю, працуе над рысункам зацікаўлена і энэргічна, але перарывіста. З цягам часу можа згубіць цікавасць да выконваемай работы. Студэнт-флегмацік наадварот працуе над рысункам спакойна без бачнага натхнення, без узлёту фантазіі, але ўпэўненна і грунтоўна. Пачатую справу ён заўсёды імкнецца давесці да канца. Але ўсё ж ў час заняткаў бывае яго неабходна прыспешліваць. Студэнт-меланхолік на занятках работу пачынае марудна без эмоцый, але бывае актыўным і працаздольным ва умовах жорсткай рэгламентацыі. У рызыковых сітуацыях губляецца і чакае падтрымкі і дапамогі. Пры гэтым назіраецца стомленасць. Студэнт-сангвінік на занятках па рысунку дэманструе актуўнасць і працаздольнасць. Здольны пераключацца на іншую работу, альбо выконваць аднаачасова розныя. Пры гэтым хутка фізічна аднаўляецца. Але бывае паспешлівы у сваіх рашэннях і дзеяннях. Не трывалы ў сваіх памкненнях.

Трэба адзначыць, што перад талентам і здольнасцю к навучанню роўныя ўсе тыпы тэмперамента, а праявы кожнага з іх залежыць ад характара, выхаванасці і ўзроўню культуры студэнта.

Звычайна ў студэнта, ў сувязі асаблівасцямі характара, ўзнікшай стомленасцю ды іншых выпадках, губляецца інтарэс да вучэбнай работы, змяншаецца працаздольнасць, паяўляецца інэртнасць. Ў такіх абставінах набываюць важнае значэнне такія ўласцівасці псіхічнай дзейнасці, як матывацыя і воля, якія дазваляюць як студэнтам, так і выкладчыкам свядома рэгуляваць свае паводзіны, пераадольваць цяжкасці і рухацца да мэты.